Катэдральная базыліка св. Францішка Ксаверыя Ў Гродне (фара)

Аўтар: кс. Ян Кучынскі
02.10.2010 03:00

Касцёл св. Францішка Ксаверыя звязаны перш за ўсё з дзейнасцю аа. езуітаў у Гродне. Яшчэ ў 1584 г. кароль Стэфан Баторый стараўся, каб айцы-езуіты пабудавалі ў Гродне касцёл і калегіум, для чаго ён ахвяраваў 10 000 польскіх злотых. Жаданні караля здзейсніліся намнога пазней, толькі ў 1622 годзе езуіты пасяліліся ў горадзе над Неманам. У 1625 г. яны адкрылі школу і, праўдападобна, у 1637 г. мелі драўляны касцёл св. Апосталаў Пятра і Паўла.

Аднак заданнем езуітаў было, паводле пажаданняў караля, пабудаваць вялікі касцёл і калегіум. Складана было пачаць будаўніцтва новай святыні, таму што падчас войнаў горад часта палілі і рабавалі. † Толькі 21 чэрвеня 1678 г. біскуп Мікалай Слупскі асвяціў вуглавы камень пад будаўніцтва новага касцёла. Будаўнічыя працы пасоўваліся вельмі марудна. У 1683 г. былі пабудаваны толькі фундаменты і падзямелле, у 1697 г. былі ўзведзены сцены, а ў 1691 г. прэзбітэрый накрылі дахам. Ва ўрачыстасць Найсвяцейшай Тройцы ў 1700 г. у яшчэ незавершанай святыні правінцыял езуітаў а. Якуб Гладавіцкі цэлебраваў першую св. Імшу. Толькі 6 снежня 1705 г. хэлмінскі біскуп Тэадор Патоцкі ў прысутнасці польскага караля Аўгуста II і рускага цара Пятра I кансэкраваў касцёл, надаючы яму тытул св. Францішка Ксаверыя. Як і хацеў кароль Баторый, была пабудавана вялікая і цудоўная святыня, даўжыня якой была 60 метраў, шырыня – 30 метраў, вышыня галоўнай навы – 21, 5 метраў, купала – 43 метры, вежы - 65 метраў вышыні, а ўнутры касцёла магло размясціцца звыш 5 тысяч вернікаў, якія маглі свабодна стаяць. У чарговыя гады касцёл станавіўся ўсё больш зграбным як знешне, так і ўнутры.

Алтары

Аўтар: кс. Ян Кучынскі
02.10.2010 03:00

[redacted]